Ганчарова – Цынкевіч Т.У. (Мінск, БДПУ)

# Пейзажны дыяпазон ранняй лірыкі Якуба Коласа

Побач з сацыяльнай тэмай значнае месца ў ранніх творах Якуба Коласа займае тэма прыроды (вершы «Перед рассветом», «Заход солнца», «В дождь», «Нива», «Ночь», «Весна», «Осень» і інш.).Ужо тут адчуваецца рука будучага майстра пейзажнага жывапісу з яго характэрнымі асабліваcцямі. Для прыкладу можна прывесці ўрывак з верша «Перед грозою»:

Ветерок затихнул,  
Травка не дрожит,  
На зелёной ветке  
Лист не шелестит.  
Лес, как заколдован,  
Стоит, полный дум.  
Смолкли насекомых  
Трескотня и шум. (1, с. 470)

Тая акалічнасць, што Колас пачаў пісаць на рускай мове (1898-1905гг.), гаворыць аб пошуках маладога паэта і аб засваенні ім багацейшай спадчыны такіх рускіх класікаў, як А.Пушкіна, М.Някрасава, А.Кальцова. Гэтыя вершы маюць вялікую цікавасць для высвятлення ідэйна-творчай эвалюцыі аўтара. Прырода ў ранніх творах Я.Коласа не ўтонах пасіўнага сузірання – яна заўсёды звязана з чалавекам, яго дзейнасцю, перажываннямі і пачуццямі. Характэрным ў гэтым плане з'яўляецца верш «Родная картинка»:

Вновь знакомая дорога:  
То овраги, то кусты,  
То, склонённые убого,  
Придорожные кресты.  
… Всё так тихо, неприютно,  
Как в лачуге бедняка,  
И сжимают поминутно  
Душу горе и тоска. (1, с. 442)

Пейзажныя замалёўкі ў творах паэта выступаюць у арганічным адзінстве з апісаннем жыцця народа.

Шырокія прасторы беларускай зямлі, сярод якіх прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады будучага пісьменніка рана абудзілі ў ім фантазію. Ён засвоіў невычарпальныя скарбы жывога беларускага слова, падслуханага ў дзяцінстве на родных палетках, ад казак і легенд, пачутых на начлезе, на рыбалцы, на Нёмане, ад песень жней і плытнікаў. Пейзажны дыяпазон ранняй лірыкі Я. Коласа пазначаны суб'ектыўна-асабістым тонам і своеасаблівай музыкай верша. Таямніца яго дарэвалюцыйнай творчасці была звязана з задушэўнасцю гучання паэтычнага радка, гарманічнасцю апісання і адчування з'яў прыроды, майстэрствам паэта стварыць цудоўныя малюнкі пейзажа.

Тэма прыроды адразу ўвайшла ў свет творчасці Я. Коласа. Песняром яе ён аб'явіў сябе ўжо ў першым друкаваным вершы «Наш родны край»:

Край наш бедны, край наш родны!  
Лес, балоты і пясок…  
Чуць дзе крыху луг прыгодны…  
Хвойнік, мох ды верасок. (1, с. 20)

Твор гэты быў напісаны, калі паэт знаходзіўся ў турме. Адарванасць ад нармальных умоў жыцця абвастрыла цягу да родных ніў і прастораў, палёў і лугоў, лясоў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гаёў. Адзіноцтва спрыяла духоўным пошукам мастака слова, цягі да прыроды, роздумам над жыццём:

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я .

К вам мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы…(1, с. 96)

Паэт усёй душой у выражэнні сваёй любові да роднай зямлі, у паказе свайго ўнутранага свету і сваіх пачуццяў. Прырода і паэтычнае «я» аўтара зліваюцца ў адно цэлае. Матыў гэтай моцнай любові да Бацькаўшчыны праходзіць амаль праз усе пейзажныя вершы Я.Коласа:

Зноў я бачу, зноў вітаю
Сілачоў вяльможных –
Па-над Нёманам у гаі
Гурт дубоў разложных.

Сам не ведаю, чым мілы,
Чым вы сэрцу любы,
Выхаванцы веку, сілы,
Магутныя дубы. (1, с. 324)

У такіх вершах, як «Асенні вечар», «Нёман», прырода аўтарам малюецца як жывая, мыслячая істота, якая ўспрымаецца перш за ўсё праз гукі, рытміка-інтанацыйны лад паэтычнага радка, які запаланяе сваёй шчырасцю і мяккасцю гучання:

Льецца Нёман паміж гораў,
Поўны сілы і красы,
У далёкія прасторы
Гоніць воды праз лясы. (1, с. 27)

Мелодыя верша запаляняе, уражвае сваёй лірычнасцю, суладна-сімфанічным гучаннем тэмы прыгажосці беларускай прыроды. Паэт услухоўваецца ў вобразы родных краявідаў:

Сыплюцца кроплі часта і дробна,
Ціха па стрэсе бубняць.
Смутак наводзіць шум іх жалобны,
Смутку таго не суняць. (1, с. 140)

Я. Колас у сваёй пейзажнай лірыцы спыняецца на запамінальных вобразах дрыжачых галін, стогну хваёвага бору («Мяцеліца»), першага грому («Вясна»), адыходу лета («Адлёт жураўлёў»), шуму ветру («Пад шум ветру»), зялёнага луга («На лузе») і інш. Вобразы ветру і грому ў яго дарэвалюцыйнай лірыцы будуць скразнымі, як адлюстраванне з'яў роднай стыхіі, так і абнаўлення жыцця («Будзе навальніца», «Пад шум ветру" і інш.) Паэт прыглядаецца да прыроды з замілаваннем, родны пейзаж зачароўвае яго. Колькі трэба было любові да гэтай зямлі, каб стварыць столькі скразных паэтычных вобразаў. Такім вобразам можна назваць, напрыклад, і вобраз хмарак. Некаторыя вершы Я. Коласа так і называліся «Хмаркі», «Хмары», «Веснавыя хмаркі», «Вячэрнія хмаркі». Хмарка ў мастака слова – гэта пара сацыяльных перамен і ў той жа час сімвал блізкасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавека да прыроды, пранізаны сыноўняй любоўю вобраз беларускай зямлі. У вершы «Журба палёў» аўтар рамантычна ў пейзажна-лірычнай плыні малюе вобраз хмар:

Адплывалі хмары – горы
Белымі клубкамі,
Нібы крыгі ледзяныя
З меднымі краямі.

Ападала іх заслона
Сумятлівай кучай,
Як бы хто на іх падзьмухаў
Сілаю калючай. (1, с. 216)

Я.Колас у гэтым творы раскрывае духоўнае багацце лірычнага героя праз вобразы пейзажу, беражліва захоўваючы квяцістую метафарычнасць.

Пейзажны дыяпазон паэзіі Я.Коласа прымушае чытача захапіцца пададзеным малюнкам, жыва ўявіць сабе і разложысты дуб, які ніколі не гнецца перад бурай, і «срэбразвонны» ручэй, і вясну, лета, восень, і такую з’яву прыроды, як навальніца.

Можна згадаць цудоўны верш паэта «Усход сонца». Чытаючы яго, нельга не зачаравацца сцэнай абуджэння прыроды пасля ночы і росквіту жыцця раніцай. Прыгажосць нараджэння новага дня раскрываецца пры дапамозе яскравых метафар, параўнанняў і эпітэтаў:

На ўсходзе неба грае
Пераліўным блескам
Сыпле золата над гаем
І над пералескам. (1, с. 77)

Мы бачым тут увасабленне, якое перадае пераліvы колераў і дзівосныя змены ў прыродзе, фарміруючы адпаведны настрой у чытача.Сонца, неба, хмары, быццам жывуць і дзейнічаюць, напаўняюць прасторы радасцю і адчуваннем паўнаты шчасця.

…Агнявыя валаконцы
Ткуцца ў шоўк чырвоны-
Гэта хмаркі ладзяць сонцу
І дзяньку кароны. (1, с.78)

Колеры і адценні ўвесь час мяняюцца, іграюць, ствараючы казачныя малюнкі, якія выклікаюць пачуццё захаплення ў чытача. Беларускі паэт бачыць у прыродзе вечны рух і абнаўленне жыцця. Я. Колас умее знайсці свае мастацкія сродкі для кожнага пейзажа, да кожнай пары года, з’явы прыроды, якія то могуць выклікаць радасць, то зноў наводзіць сум. Паэт вельмі тонка адчувае і праз выкарыстанне розных дэталяў раскрывае асаблівасці беларускіх пейзажаў: лясоў, рэк, лугоў. Прырода малюецца ім як разгорнутая кніга, якая шмат чаго можа расказаць, навесці на глыбокі роздум аб жыцці і яго заканамернасцях.

Літаратура

1. Колас, Я. Збор твораў: у 12 т. Т. 1. Вершы 1898-1917 / Якуб Колас; рэд. тома В. Барысенка, П. Броўка, К. Крапіва і інш.- Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1961.- 560 с.

2. Навуменка, І.Я. Збор твораў: у 6 т. Т.6.Літаратурная крытыка / І. Я.Навуменка. – Мінск: Маст.літ., 1982. – 535 с.

---------------------------------------------------------------------

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ